№ Д201中华人民共和国出境入境管理法

9. *Шумилин, А. Г.* Белорусско-китайское научно-техническое сотрудничество: состояние и перспективы развития [Электронный ресурс] / А. Г. Шумилин. – Режим доступа: http://belisa.org.by/ru/izd/stnewsmag/4_2016/art2_39_2016.html. – Дата доступа: 15.02.2019.

10. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.mps.gov.cn/n2254996/n2254998/c4221559/content.html. – Дата доступа: 17.02.2019.

**(Дата подачи: 19.02.2019 г.)**

*Р. У. Зянюк*
Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск
*R. Zianiuk*
Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk

**УДК272-788-9(476)“1772/1917”:930.2**

## РЫМСКА-КАТАЛІЦКІЯ МАНАСКІЯ ОРДЭНЫ І КАНГРЭГАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ (1772–1917 гг.): АЙЧЫННАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПЫТАННЯ

## NATIONAL HISTORIOGRAPHY OF THE ISSUE OF THE ROMAN-CATHOLIC MONASTIC ORDERS AND CONGREGATIONS IN BELARUS (1772–1917)

*Даследуецца айчынная гістарыяграфія гісторыі рымска-каталіцкіх манаскіх ордэнаў у Беларусі. Вызначаны найбольш даследаваныя аспекты праблемы (палітыка расійскіх уладаў, адукацыйная дзейнасць каталіцкіх ордэнаў) а таксама тыя, якія не знайшлі адлюстравання ў беларускай гістарыяграфіі (адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел ордэнаў на беларускіх землях, іх гаспадарчая і эканамічная дзейнасць, манаства як асобная група духавенства).*

*Ключавыя словы: манаскія ордэны, кангрэгацыі, Расійская імперыя, гістарыяграфія.*

*In the article national historiography of Roman-Catholic monastic orders and congregations is researched. The most well-researched aspects of the issue (such as Russian governmental policy and educational activities of the Catholic orders), as well as blind spots of the Belarusian historiography (territorial and administrative structure of the orders in Belarus, their economic activities, and status of the monkhood as a distinctive clerical group) are identified.*

*Key words: monastic orders, congregations, Russian Empire, historiography.*

Адной з найбольш колькасных і дынамічна развіваючыхся структурных адзінак рымска-каталіцкай царквы традыцыйна з’яўляюцца манаскія ордэны і кангрэгацыі. Беларускія энцыклапедычныя даведнікі вызначаюць манаскія ордэны як цэнтралізаваныя манаскія аб’яднанні, дзейнасць якіх рэгулюецца статутамі, зацверджанымі Папам Рымскім [1]. На далучаных да Расійскай імперыі беларуска-літоўскіх землях у канцы XVIII ст. дзейнічала 20 мужчынскіх і 8 жаночых манаскіх ордэнаў і кангрэгацый (мужчынскія:

езуіты, дамініканцы, бернардзінцы, канвентуальныя францысканцы, піяры, трынітарыі, місіянеры, канонікі рэгулярныя ад пакуты, кармеліты старых правіл, кармеліты босыя, аўгусцінцы, бенедзікцінцы, канонікі латэранскія, баніфратры, рохіты, цыстэрцыянцы, камуністы, картузіянцы, марыяне, іааніты; жаночыя – марыявіткі, сёстры міласэрнасці (шарыткі), бенедзікцінкі, бернардзінкі, дамініканкі, візіткі, брыгіткі, цыстэрцыянкі).

У беларускай гістарыяграфіі каталіцкія манаскія ордэны і кангрэгацыі на беларуска-літоўскіх землях ў перыяд Расійскай імперыі ў якасці самастойнага прадмета даследавання не станавіліся. Традыцыйна яны разглядаліся ў кантэксце гісторыі каталіцкага касцёла ў Беларусі, аднак заўсёды з абмежаванымі храналагічнымі рамкамі. Да 1990-х гг. гэтыя даследаванні абмяжоўваліся 1795 г. і не закраналі далейшы перыяд да 1917 г. Сярод найбольш грунтоўных даследаванняў па гісторыі каталіцкага касцёла савецкага часу – працы гродзенскага даследчыка Я. Мараша [2; 3; 4; 5]. Разгляд дзейнасці каталіцкага касцёла ў працах гэтага аўтара адпавядае традыцыям марксісцка-ленінскай школы, што цалкам адносіцца і да дзейнасці каталіцкіх манаскіх ордэнаў. Перш за ўсё гэта праяўляецца ў гіпертрафіраванай увазе да дзейнасці ордэна езутаў і атаесамленні яе з найбольш моцнай і актыўнай сілай касцёла (якіх выдзяляецца дзве: Ватыкан і езуіты). Ордэн надзяляецца эпітэтам «штурмового отряда Ватикана, активным орудием его самых реакционных и злодейских замыслов, направленных против русского и белорусского народов» [5, с. 11]. У цэлым дзейнасць ордэна езуітаў характарызуецца наступным чынам: «В своей ненависти к белорусскому и украинскому народам иезуиты дошли до того, что выработали людоедский план их физического истребления, уничтожения языка и культуры, если они не подчинятся их влиянию» [5, с. 12].

У далейшых публікацыях даследчык закранаў і іншыя аспекты дзейнасці каталіцкага касцёла на беларускіх землях, аднак працягваў абмяжоўвацца перыядам да 1795 г. [6; 7; 8]. Доктарская дысертацыя Я. Мараш прысвечана, у тым ліку, разгляду працэсаў умацавання на беларускіх землях пазіцый каталіцкіх ордэнаў, павелічэння колькасці іх манастыроў і пераўтварэння каталіцкай царквы ў буйнога землеўласніка. Удзялялася ўвага і становішчу сялян ва ўладаннях каталіцкай царквы. На асобных прыкладах аўтар ілюстраваў гэтыя працэсы, не паказваючы, аднак, агульнага эканамічнага становішча па кожнага ордэна паасобку і ордэнаў у цэлым. У якасці сродкаў і метадаў ідэалагічнага ціску каталіцкага касцёла на насельніцтва Беларусі даследчык вылучаў брацтвы і школы. Нягледзячы на грунтоўны фактычны матэрыял, выкарыстаны для аналізу ўсіх гэтых аспектаў, аўтар усё ж не змог вылучыць сутнасных момантаў у арганізацыі і дзейнасці рымска-каталіцкай царквы і манаскіх ордэнаў. Менавіта Я. Марашу належыць першынства ў распрацоўцы храналогіі з’яўлення на беларускіх землях каталіцкіх манаскіх ордэнаў і пашырэння сеткі іх манастыроў. Але дадзеныя працэсы ён характарызуе як праявы вастрыні класавай барацьбы,

якая ўскладнялася нацыянальна-класавымі супярэчнасцямі.

Выключэннем у беларускай савецкай гістарыяграфіі стала спецыяльнае вывучэнне адзінага манаскага ордэна – Таварыства Езуса (езуітаў) – якому прысвечана дысертацыя і манаграфія гродзенскай даследчыцы Т. Бліновай [9; 10]. У іх асвятляюцца працэсы пранікнення і замацавання ордэна на беларуска-літоўскіх землях, паказана эканамічная дзейнасць езуітаў. Метадалагічным падмуркам прац гэтага аўтара таксама з’яўляецца марксісцка-ленінская канцэпцыя, што прасочваецца ў іх змесце (асвятленні эканамічнага станаўлення езуіцкіх манастыроў, становішча сялян у езуіцкіх маёнтках, а таксама праяў класавай барацьбы насельніцтва Беларусі супраць прыгнёту ордэна). Даследчыца практычна не закранае перыяд Расійскай імперыі, акрамя кароткай даведкі аб тым, што ў XIX ст. становішча сялян у езуіцкіх маёнтках яшчэ больш пагоршылася, што аўтар пацвердзіла шэрагам факталагічных прыкладаў.

1990-я гг. змянілі кірунак даследавання гісторыі Беларусі, якая пачала даследавацца з нацыянальна-дзяржаўных пазіцый з выкарыстаннем новых метадалагічных падыходаў. Сярод новых кірункаў беларускай гісторыі пачала даследавацца і канфесійная гісторыя. Ужо ў 1998 г. выйшла першая абагульняючая праца па гісторыі канфесій ў Беларусі аўтарства В. Грыгор’евай, А. Філатавай, У. Навіцкага і У. Завальнюка [11]. Праца ахоплівае перыяд з канца XVIII па канец XX ст. Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі ў працы адлюстраваны змены ў становішчы канфесій на працягу азначанага перыяду. У манаграфіі ў кантэксце рэфармавання каталіцкага касцёла ў Расійскай імперыі вылучаны і асноўныя мерапрыемствы адносна ордэнаў (перападпарадкаванне іх біскупам, змены ў становішчы ордэна езуітаў, касацыі манастыроў). Гэтыя ж мерапрыемствы разгледжаны і ў кандыдацкай дысертацыі і манаграфіі І. Ганчарука [12]. Менавіта І. Ганчарук у сваіх даследаваннях упершыню паказаў падзел усёй групы разнастайных манаскіх аб’яднанняў на манаскія і жабрачыя ордэны, клерыкаў рэгулярных і г. д. Аднак, даследаванне І. Ганчарука абмяжоўваецца перыядам да 1830-х гг. – часу, калі дзейнасць ордэнаў (акрамя езуітаў) не была абмежавана.

У даследаваннях па гісторыі хрысціянскіх цэркваў аўтарства В. В. Яноўскай [13] і А. Ганчара [14] увага даследчыкаў звернута на перыяд другой паловы XIX ст. – пачатку XX ст. (60-я гг. XIX – 1905–1914 гг.). Дзейнасць ордэнаў аўтарамі даследавана нераўнамерна. У даследаванні В. В. Яноўскай прапісаны элементы палітыкі расійскіх уладаў у дачыненні да ордэнаў (апошняя пасляпаўстанцкая хваля касацыі манастыроў), гэтыя ж дадзеныя фактычна паўтараюцца ў даследаванні А. Ганчара. Фактычнае спыненне дзейнасці ордэнаў у гэты перыяд выклікае лагічнае звужэнне спектру ўвагі даследчыкаў на іх дзейнасць.

У кантэксце спецыяльных даследаванняў па гісторыі канфесійнай палітыкі А. Філатавай [15] адлюстраваны рэпрэсіўныя мерапрыемствы царскіх уладаў адносна каталіцкага касцёла ў выніку падаўлення паўстанняў

1830–1831 гг., якія праявіліся ў масавай касацыі каталіцкіх манастыроў. Праявы гэтай палітыкі адлюстраваны ў шэрагу артыкулаў іншых аўтараў, пры-свечаных касацыі канкрэтных кляштараў [16; 17].

У якасці асобнага кірунку канфесійнай палітыкі расійскіх уладаў адносна рымска-каталіцкай царквы манаскія ордэны і кангрэгацыі разгледжаны ў абагульняючай працы «Канфесійны фактар у сацыяльным развіцці Беларусі» [19]. У ёй выдзяляюцца не толькі касацыйныя мерапрыемствы, але і пытанні па рэгламентацыі ўнутрыордэнскага жыцця, абмежавальнай палітыкі адносна асобных накірункаў дзейнасці ордэнаў, а таксама дзейнасці канкрэтных ордэнаў і кангрэгацый (езуіты, місіянеры).

Асобна пытанні палітыкі расійскіх уладаў па ліквідацыі манастырскага землеўладання на тэрыторыі Беларусі і яе рэалізацыю ў перыяд канца XVIII ст. па 1830 г. даследаваў У. Сосна [20]. Аднак у дадзены перыяд пытанні кляштарнага землеўладання і землекарыстання не былі абмежаваны і тычыліся толькі прынясення прысягі на вернасць расійскаму трону.

Уключэнне рымска-каталіцкай царквы ва ўсе сферы жыцця грамадства беларуска-літоўскіх губерняў (палітычную, сацыяльна-эканамічную, культурную) абумовіла зварот да даследавання яе удзелу ў гэтых працэсах. Разам з гэтым дзейнасць манаскіх ордэнаў да гэтага часу не выдзяляецца ў якасці асобнага прадмета даследавання. Выключэнне складае адукацыя – менавіта манаскія ордэны з'яўляліся дамінуючым складнікам у арганізацыі і ўтрыманні сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў на беларускіх землях у перыяд да пачатку 30-х гг. XIX ст.

Першыя даследаванні па гісторыі асобных навучальных устаноў, якія належалі ордэну езуітаў, з'явіліся ўжо ў XIX ст. (аўтарства А. Сапунова [22; 23]). Дамінацыя ордэнскіх навучальных устаноў у адукацыйнай сферы ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. вызначыла лагічны зварот да вывучэння гэтага кірунку дзейнасці ордэнаў і ў савецкай гістарыяграфіі. Аднак, у той перыяд даследаванне іх адукацыйнай дзейнасці адбывалася выключна ў кантэксце агульных даследаванняў па гісторыі адукацыі. Прычым усе аўтары адзінагалосна сцвярджалі аб тым, што каталіцкія манаскія ордэны ў першай палове XIX ст. з'яўляліся дамінуючымі як па колькасці навучальных устаноў, так і па колькасці вучняў у іх [24; 25; 26]. Менавіта гэты кірунак іх дзейнасці перайшоў у сферу зацікаўленасці сучасных гісторыкаў, якія даследуюць як уласна адукацыйную дзейнасць асобных ордэнаў [21; 28; 29; 31; 32; 33; 34], так і іх дзейнасць у галіне адукацыі як складаючую частку адукацыйнай актыўнасці рымска-каталіцкага касцёла [11; 18; 35; 36]. Першым у сучаснай беларускай гістарыяграфіі комплексна на гэты кірунак дзейнасці звярнуў увагу І. Ганчарук. У сваіх працах ён адлюстраваў гісторыю сярэдніх навучальных устаноў для свецкіх і сістэму падрыхтоўкі кадраў духавенства, прынятую ў манаскіх ордэнах у перыяд 1772–1830 гг. Для беларускай гістарыяграфіі гэта былі наватарскія даныя,

якія, аднак, абапіраліся на даследаванні польскіх гісторыкаў (пераважна адносна арганізацыі фармацыйных дамоў). Даследчыку не хапае рэгіянальнай (беларускай) спецыфікі, якую магчыма дапоўніць архіўнымі матэрыяламі. Даныя, якія падае аўтар у сваіх працах, нязменныя – аднолькавы матэрыял у дысертацыі, манаграфіі і ў тых артыкулах, якія выйшлі пасля публікацыі першых дзвюх пазіцый [12; 36].

Арганізацыя, структура і дзейнасць навучальных ўстаноў каталіцкага касцёла (у тым ліку і тых, якія належалі манаскім ордэнам і кангрэгацыям) даследавана ў дысертацыі, манаграфіі і шэрагу артыкулаў Р. У. Зянюк [35]. Звужаючы прадмет даследавання, аўтар паказала працэс эвалюцыі гэтай групы школ на працягу практычна ўсяго перыяду існавання Расійскай імперыі – ад першага падзелу Рэчы Паспалітай да пачатку Першай сусветнай вайны. Гэта дазволіла паказаць эвалюцыю адукацыйна-канфесійнай палітыкі расійскіх уладаў як у канфесійнай, так і ў адукацыйнай сферы, і ў сувязі з гэтым праілюстраваць дынаміку колькасці каталіцкіх навучальных устаноў і арганізацыю іх дзейнасці. Ордэнскія школы выдзяляюцца ў асобную групу толькі пры даследаванні ўнутрыордэнскай сістэмы адукацыі, ордэнская прыналежнасць астатніх (агульнаадукацыйных) агаворваецца.

Ордэны, якія мелі найбольш моцныя пазіцыі ў галіне адукацыі на беларуска-літоўскіх землях, даследаваны не толькі ў кантэксце іх гісторыі, але і ў фармаце гістарыяграфіі. Так, айчыннай гістарыяграфіі адукацыйнай дзейнасці ордэна езуітаў прысвечана дысертацыя і шэраг артыкулаў Т. Палікоўскай [37]. Аўтар выдзяляе тры перыяды ў даследаванні праблемы: апісальна-навуковы (другая палова XIX ст. – 20-я гг. XX ст.), навукова-матэрыялістычны (30-я – 80-я гг. XX ст.), плюралістычны (90-я гг. XX ст. – да сённяшняга дня).

Даследаванню гістарыяграфіі адукацыйнай дзейнасці піяраў прысвечаны артыкул Т. М. Заблоцкай [38]. Аўтар, падобна як і ўсе беларускія даследчыкі канфесійнай гісторыі, дзеліць даследаванні па нацыянальных школах на беларускую і польскую, абіраючы ў якасці ўласнага прыярытэту апошнюю. Разам з гэтым, аўтар не зусім добра арыентуецца ў беларускай гістарыяграфіі, што праяўляецца ў адсутнасці аналізу асноўных абагульняючых прац беларускіх даследчыкаў. Адсутнічаюць згадкі пра літоўскую, украінскую, расійскую гістарыяграфічныя школы.

Уласна ордэны на тэрыторыі Беларусі ў XIX ст. даследаваны ў вельмі нязначнай ступені. Напрыклад, ордэну прапаведнікаў (дамініканцаў) прысвечаны артыкул Р. Зянюк [39].

Найбольшая колькасць прац беларускіх даследчыкаў прысвечана структурным адзінкам каталіцкіх манаскіх ордэнаў на беларускіх землях – іх манастырам. З’яўленне такога роду даследаванняў часта звязана з краязнаўчай працай даследчыкаў або ў сувязі з выяўленнем і даследаваннем канкрэтнага дакумента, на аснове якога і ствараецца артыкул. Прымяняльна да перыяду канца XVIII – пачатку XX ст. такімі дакументамі з’яўляліся акты візітацый,

на падставе якіх шэраг аўтараў зрабілі публікацыі [40; 41; 42]. Вартасць апошняй групы прац – ва ўвядзенні ва ўжытак актаў візітацый, аднак яны даюць уяўленне пра функцыянаванне манастыра толькі ў момант здзяйснення візітацыі. Аўтары, як правіла, не даюць каментароў адносна змянення палітычнай і эканамічнай сітуацыі і рэакцыі на іх насельнікаў манастыроў або візітатара, што выяўлялася б у прадпісаннях, зробленых візітатарам або ў занатаванні ім зменаў, выкліканых знешнімі прычынамі.

Больш грунтоўнымі з'яўляюцца артыкулы, якія датычаць гісторыі манастыра на працягу ўсяго перыяду яго існавання, што дазваляе паказаць эвалюцыю яго становішча ў перыяды рознай палітычнай і сацыяльна-эканамічнай сітуацыі [напр.: 43]. Разам з гэтым, такія працы не адлюстроўваюць становішча манастыра ў кантэксце гісторыі ордэна, а паказваюць яго як самастойную адзінку, што таксама не ў поўнай меры адпавядае рэчаіснасці.

Увагу гісторыі і дзейнасці кляштараў надаюць і краязнаўцы ў сваіх навукова-папулярных публікацыях, прысвечаных гісторыі канкрэтнай мясцовасці або рэгіёна. Напрыклад, у даследаваннях М. Быхаўцава па гісторыі Ваўкавышчыны ўтрымліваецца вялікая колькасць фактаграфічнага матэрыялу па гісторыі касцёлаў у гэтым рэгіёне [44; 45]. Разам з гэтым, аўтар не надае ўвагі фактам ордэнскай прыналежнасці касцёлаў на гэтай тэрыторыі.

Найбольш даследавана гісторыя і дзейнасць кляштараў, якія належалі ордэну францысканцаў. Іх даследчык, францысканец Ю. Макарчык даследуе як гісторыю асобных кляштараў (напрыклад, у Свіслачы [46]), так і гісторыю тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінак ордэна на беларускіх землях (Гродзенскай кустодзіі [47] і Літоўска-Беларускай правінцыі [48]). Са сферы навуковых зацікаўленасцяў аўтара выпадае гаспадарча-эканамічная дзейнасць ордэна.

Манаскае духавенства як асобная група ў складзе рымска-каталіцкага духавенства і духавенства беларуска-літоўскіх губерняў таксама яшчэ не даследавана. Аднак, ужо апублікаваны шэраг артыкулаў, прысвечаных асобным членам манаскіх ордэнаў [49] або іх дзейнасці [50]. Да гістарыяграфічных элементаў мазаікі гісторыі ордэнаў ў Беларусі можна аднесці працы, прысвечаныя асабістаму складу манастыроў [51]. Артыкул З. Антановіч важны не столькі адлюстраваннем персанальнага складу, колькі ілюстрацыяй канфесійнай палітыкі расійскіх уладаў па касацыі каталіцкіх манастыроў і высылцы манахаў розных ордэнаў у адзін, як гэта мела месца ў Нясвіжы. Разам з гэтым, відавочныя метадалагічныя праблемы тэрміналогіі – «персанальны склад манастыра» – гэта прадстаўнікі аднаго ордэна, прызначаныя туды ордэнскай уладай. Тыя ж, хто ў манастыр трапляў іншымі шляхамі, як і людзі, якія там працавалі, не з'яўляюцца ў поўнай меры яго членамі.

Адзін з кірункаў даследаванняў беларускіх мастацтвазнаўцаў – культуратворчая дзейнасць ордэнаў. Да яе можна аднесці працы па гісторыі

архітэктуры, перадусім аўтарства Т. Габрусь. У яе працах сцвярджаецца, што носьбітамі асноўных культурных ідэй у архітэктуры (напр. сарматызму) з'яўляліся менавіта каталіцкія манаскія ордэны, перш за ўсё дамініканцы [52; 53; 54; 55; 57]. У 2013 г. было выдадзена картаграфічна-даведачнае выданне «Каталіцкія кляштары XIV–XVIII стст. у межах сучаснай Беларусі». Праца гэтая, аднак, дастаткова слабая ў метадалагічным плане: у ёй не паказаны працэсы і этапы павелічэння колькасці манастыроў асобных ордэнаў, не вызначана іх тэрытарыяльна-адміністрацыйная прыналежнасць; незразумела, якім крытэрыем карыстаўся аўтар у выбары ілюстрацый будынкаў манастыроў розных ордэнаў (праілюстраваны не ўсе) і г. д. [56]. Як бачна, перыяд даследаванняў гісторыкаў архітэктуры адносіцца да часу XVII–XVIII стст. Перыяду Расійскай імперыі прысвечаны толькі адзінкавыя публікацыі [58].

Такім чынам, можна сцвярджаць, што ў беларускай гістарыяграфіі каталіцкія манаскія ордэны ў перыяд 1772–1917 гг. не станавіліся прадметам асобнага даследавання. Найчасцей іх дзейнасць у той ці іншай ступені асвятлялася ў кантэксце гісторыі каталіцкага касцёла ў Беларусі. Да найбольш даследаваных пытанняў адносіцца адукацыйная дзейнасць ордэнаў; часткова даследаваны палітыка расійскага ўраду адносна ордэнаў, гісторыя асобных манастыроў а таксама асобных ордэнаў (езуітаў, францысканцаў, дамініканцаў). Да пытанняў, якія практычна не знайшлі адлюстравання ў айчыннай гістарыяграфіі, адносяцца: ордэнскі адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел і яго змены; гаспадарчая і грамадска-палітычная дзейнасць ордэнаў і іх членаў. Адсутнічаюць таксама працы, прысвечаныя метадалагічнай складаючай пытання: 1) вызначэнні, чым з'яўляецца манаскі ордэн як форма рэлігійнай арганізацыі; 2) пытанням тэрміналогіі ў даследаванні гісторыі каталіцкай царквы агулам і манаскіх ордэнаў у прыватнасці і інш. У плане храналогіі даследаванняў таксама выдзяляюцца сур'ёзныя прагалы: традыцыйна даследуюцца перыяды 1772–1830 гг. і 1860–1914 гг.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Дабрынін, М.* Ордэны манаскія / М. Дабрынін // Энцыклапедыя ВКЛ: у 3 т. – Т. 2. – С. 378.

2. *Мараш, Я. Н.* Из истории борьбы народных масс Белоруссии против экспансии католической церкви / Я. Н. Мараш. – Минск: Выш. шк., 1969. – 220 с.

3. *Мараш, Я. Н.* Ватикан и католическая церковь в Белоруссии (1579–1795 гг.) / Я. Н. Мараш. – Минск: Выш. шк., 1971. – 272 с.

4. *Мараш, Я. Н.* Католическая церковь в истории Белоруссии: материал в помощь лектору / Я. Н. Мараш. – Минск, 1981. – 23 с.

5. *Мараш, Я. Н.* Агрессия католицизма и Ватикана в Литве и Белоруссии во второй половине XVI – начале XVII вв.: автореф. дис. … канд. ист. наук. / Я. Н. Мараш. – Минск, 1954. – 20 с.

6. *Мараш, Я. Н.* Ватикан и Белоруссия. Очерки экспансии католической церкви в Белоруссии (1569–1795): автореф. дис. … докт. ист. наук / Я. Н. Мараш. – Минск,

1968. – 46 с.
7. *Мараш, Я. Н.* Очерки экспансии католической церкви в Белоруссии (1569–1795 гг.): автореф. дис. … докт. ист. наук / Я. Н. Мараш. – Минск, 1972. – 44 с.

8. *Мараш, Я. Н.* Положение крестьян в монастырских владениях католической церкви западных районов Белоруссии второй половины XVIII в. / Я. Н. Мараш // Материалы по истории сельского хозяйства и крестьянства СССР. – 1974. – Сб. 8. – С. 152–179.
9. *Блинова, Т. Б.* Орден иезуитов в Белоруссии – крупный вотчиник и эксплуататор народных масс (1570–1774 гг.): автореф. дис. … канд. ист. наук. / Т. Б. Блинова. – Минск, 1979. – 30 с.
10. *Блинова, Т. Б.* Иезуиты в Белоруссии / Т. Б. Блинова. – Минск: Беларусь, 1990. – 108 с.
11. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.) / В.В. Грыгорева [і інш.]; навук. рэд. У. І. Навіцкі. – Мінск: Экаперспектыва, 1998. – 337 с.
12. *Ганчарук, І.* Рымска-каталіцкі касцёл у Беларусі (1772–1830 гг.) / І. Ганчарук, А. Ганчар. – Гродна: ГДАУ, 2012. – 381 с.
13. *Яноўская, В. В.* Хрысціянская царква ў Беларусі ў 1863–1914 гг. / В. В. Яноўская. – Мінск: БДУ, 2002. – 198 с.
14. *Ганчар, А. И.* Римско-католическая церковь в Беларуси (вт. пол. XIX – нач. XX в.). Исторический очерк / А. И. Ганчар. – Гродно: ГГАУ, 2010. – 511 с.
15. *Филатова, Е. Н.* Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси 1772–1860 гг. / Е. Н. Филатова. – Минск: Белорусская наука, 2006. – 192 с.
16. *Zianiuk, R.* «Мы до упразднения нашего решительно ни в чем не виноваты»: касацыя кляштараў бенедыктынак у Мінскай і Гродзенскай губернях у XIX ст. / R. Zianiuk // Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės moterų vienuolijos: istorija ir paveldas. – Kaunas: Vitauto didziojo universitetas, Versus Aureus, 2014. – S. 79–87.
17. *Радзюк, А. Р.* Ліквідацыя гродзенскага дамініканскага кляштара ў кантэксце палітычных, сацыяльных і культурных змен на Гродзеншчыне ў 30-я гг. XIX ст. / А. Р. Радзюк // Культура, наука, образование в современном мире: материалы V Междунар. науч. конф. / Гродненский государственный аграрный университет. – Гродно: ГГАУ, 2011. – С. 415–419.
18. Канфесійны фактар у сацыяльным развіцці Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / В. В. Яноўская; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларуская навука, 2015. – 496 с.
19. *Зянюк, Р. У.* Уключэнне ў прававую структуру Расійскай імперыі рымска-каталіцкай царквы / Р. У. Зянюк // Канфесійны фактар у сацыяльным развіцці Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / навук. рэд. В. В. Яноўская. – Мінск: Беларус.навука, 2015. – С. 96–120.
20. *Сосно, В.* Закрытие католических монастырей и ликвидация их землевладения в Беларуси и Литве (30-е гг. XIX в.) / В. Сосно // Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės moterų vienuolijos: istorija ir paveldas. – Kaunas: Vitauto didziojo universitetas, Versus Aureus, 2014. – S. 89–93.
21. *Блинова, Т. Б.* Иезуиты в Беларуси. Роль иезуитов в организации образования и просвещения / Т. Б. Блинова. – Гродно: ГрГУ, 2002. – 427 с.
22. *Сапунов, А. П.* Заметка о коллегии и академии иезуитов в Полоцке / А. П. Сапунов. – Витебск: Тип. Губ. Правл., 1890. – 34 с.
23. *Сапунов, А. П.* Историческая записка 75-летия Витебской гимназии (1808–1883 гг.) / А. П. Сапунов. – Витебск: Тип. Губ. Правл., 1884. – 167 с.
24. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытных часоў да 1917 г. / А. М. Ткачоў [і інш.]; пад рэд. М. А. Лазарука. – Мінск: Народная Асвета, 1985. – 464 с.
25. Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі / пад рэд.

С. А. Умрэйкі. – Мінск: Народная асвета, 1986. – 624 с.

26. *Поссе, В. С.* Просвещение в Белоруссии в конце XVIII первой половине XIX в.: дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / В. С. Поссе. – Минск, 1963. – 385 с.

27. *Самусік, А. Ф.* Асветніцкая дзейнасць дамініканскага ордэну на беларускіх землях у XVIII – першай трэці XIX ст. / А. Ф. Самусік // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа: в 2 ч. – Гродна, 2009. – Ч. 2. – С. 195–200.

28. *Самусік, А. Ф.* Дзейнасць манаскіх ордэнаў у галіне адукацыі на Беларусі ў першай трэці XIX ст. / А. Ф. Самусік // Гісторыя: праблемы выкладання. – 1998. – № 1. – С. 37–47.

29. *Самусік, А. Ф.* Манаскія гімназіяльныя вучылішчы Гродзенскай губерні ў першай трэці XIX ст. / А. Ф. Самусік // Веснік ГрДУ. – 2007. – № 3, серыя 1. – С. 44–47.

30. *Самусік, А. Ф.* Развіццё сістэмы асветы на беларускіх землях у сямідзесятых гадах XVIII – трыццатых гадах XIX стагоддзяў: дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / А. Ф. Самусік. – Мінск, 1998. – 136 арк.

31. *Соркіна, І. В.* Навучальныя ўстановы каталіцкіх ордэнаў і базыльян ў мястэчках Беларусі канец (XVIII – першая трэць XIX ст.) / І.  В. Соркіна // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа : зборнік навук. артыкулаў: в 2 ч. / Мін. Адукацііі РБ, Гр. дзярж. ун-т ім. Я. Купалы; рэдкал. С. В. Марозава [і інш.]. – Гродна, 2009. – Ч. 2. – С. 200–209.

32. *Карнілава, Л.* Ордэн бернардзінцаў у Беларусі : навучальныя ўстановы / Л. Карнілава // Беларусіка = Albaruthenica 6 / рэдкал. У. Конан [і інш.]. – Мінск, 1997. – Ч. 1: Беларусь паміж Усходам і Захадам: Праблемы міжнацыян., міжрэлігійн. і міжкультур. ўзаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу. – С. 188–192.

33. *Зянюк, Р.* Адукацыйная дзейнасць ордэна дамініканцаў у заходніх губернях Расійскай імперыі к. XVIII–XIX ст. / Р. Зянюк // Історія релігій в Україні. Науковий щорічник. – Львів: Логос, 2008.  – Кн. 1. – С. 338–345.

34. *Zianiuk R.* Działalność edukacyjna dominikanów zabialskich w końcu XVIII i w pierwszej połowie XIX wieku / R. Zianiuk // Przestrzeń klasztoru – przestrzeń kultury. Piśmiennictwo, książka, edukacja – Red. Cybulski Ł., Pietrzak-Thebault J. – Warszawa, 2017. – S. 163–181.

35. *Зянюк, Р. У.* Навучальныя ўстановы рымска-каталіцкай царквы ў Беларусі (1772–1914 гг.) / Р. У. Зянюк. – Мінск: Беларус.навука, 2017. – 300 с.

36. *Ганчарук, І.* Каталіцкі касцёл і развіццё сярэдняй адукцыі ў Беларусі ў 1795–1830 гг. / І. Ганчарук // Studia theologica Grodnensia. Гродзенскія тэалагічныя даследаванні. – 2016. – Вып. 10. – С. 254–265.

37. *Палікоўская, Т. І.* Айчынная гістарыяграфія другой паловы XIX – пачатку XX ст. гісторыі адукацыйнай дзейнасці езуітаў на тэрыторыі Беларусі // Весці БДПУ. Серыя 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2015. – № 4. – С. 7–11.

38. *Заблоцкая, Т. М.* Да гісторыі вывучэння адукацыйнай і культурна-асветніцкай дзейнасці каталіцкага ордэна піяраў літоўскай правінцыі на беларускіх землях у канцы XVII – пачатку XX ст. / Т. М. Заблоцкая // Научные труды Республиканского института Высшей школы: в 3 ч. – 2018. – Вып. 18. – Ч. 1. – С. 145–152.

39. *Зянюк, Р. О*рдэн прапаведнікаў на землях Беларусі / Р. Зянюк // Наша вера. – 2015. – № 2. – С. 8–14.

40. *Лаўрык, Ю.* Мінскія бэрнардыны ў 1796 годзе / Ю. Лаўрык // Наша вера. – 2009. – № 4. – С. 63–69.

41. *Лаўрык, Ю.* Менскія дамінікане ў 1796 годзе / Ю. Лаўрык // Наша вера. 2011. – № 3. – С. 66 – 71.

42. *Лаўрык, Ю.* Менскія бэрнардынкі ў 1796 гдзе / Ю. Лаўрык // Наша вера. 2010. – № 4. – С. 66–69.

43. *Гарматны, В. П.* Кляштар картузаў у Бярозе (1648–2008) / В. П. Гарматны // Религия и общество-3: актуальные проблемы современного религиоведения: сб. науч.трудов / ред. В. В. Старостенко, О. В. Дьяченко. – Могилев: МГУ, 2008. – С. 78–81.

44. *Быхаўцаў, М. І.* Гісторыя Касцёла на Ваўкавышчыне / М. І. Быхаўцаў. – Мінск: Смэлтак, 2017. – 752 с.

45. *Быховцев, Н. И.* История просвещения н Волковыщине (до 1915 года) / Н. И. Быховцев. – Минск: Смэлток, 2014. – 336 с.

46. *Макарчык, Ю.* Гісторыя прабывання айцоў францішканцаў у Свіслачы-Занявічах і спісы вернікаў парафіі Вялікія Эйсманты / Ю. Макарчык. – Гродна: Гродзенская дыяцэзія Рымска-каталіцкага касцёла ў Рэспубліцы Беларусь, 2009. – 452 с.

47. *Makarczyk, J.* Kustodia Grodzieńska Zakonu Braci Mniejszych Konwentualnych w latach 1687–1832 / J. Makarcyzk. – Гродна: Гродзенская дыяцэзія Рымска-каталіцкага касцёла ў Рэспубліцы Беларусь, 2006. – 220 с.

48. *Makarczyk, J.* Prowincja Litewsko-Białoruska Zakonu Braci Mniejszych Konwentualnych w latach 1687–1845 / J. Makarcyzk. – Гродна: Гродзенская дыяцэзія Рымска-каталіцкага касцёла ў Рэспубліцы Беларусь, 2012. – 556 s.

49. *Брыль, А. Ф.* Звесткі пра Каятана Марашэўскага, Міхала Цяцерскага і Ігнацыя Юрэвіча ў дакументах Дамініканскага ордэна / А. Ф. Брыль // Роднае слова. – 2018 – № 4. – С. 3–4.

50. *Зянюк, Р.* Дзейнасць Ф.Цяцерскага ў галіне адукацыі не Віцебшчыне / Р. Зянюк // Віцебскія старажытнасці: матэрыялы навук. канф., Віцебск, 20–21 кастр. 2011 г.; рэдкал.: Г. У. Савіцкі [і інш.]. – Мінск, 2013. – С. 55–58.

51. *Антановіч, З.* Асабісты склад Нясвіжскага дамініканскага мужчынскага кляштара паводле фармулярных спісаў рымска-каталіцкага духавенства Мінскай дыяцэзіі за 1867 г. / З. Антановіч // Acta Anniversaria. – 2014. – Т. 1. – С. 7–18.

52. *Габрусь, Т. В.* Носьбіты ідэалогіі сарматызму / Т. В. Габрусь // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. – 2015. – Вып. 18. – С. 24–30.

53. *Габрусь, Т. В.* Дамініканскія святыні ў Навагрудку / Т. В. Габрусь // Гістарычная і культурная спадчына Навагрудчыны: мінулае і сучаснасць: матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф. – Мінск, 2004. – С. 13–18.

54. *Габрусь, Т. В.* Гісторыка-культурны аспект пачатку будаўнічай дзейнасці ордэна дамініканцаў у Беларусі / Т. В. Габрусь. // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. 2014. – Вып. 17. – С. 10–17.

55. *Габрусь, Т. В.* Святыні ордэна прапаведнікаў / Т. В. Габрусь // Наша вера. – 2003. – № 4. – С. 54–61.

56. *Міцкевіч, В. С.* Каталіцкія кляштары XIV – XVIII стст. у межах сучаснай Беларусі / В. С. Міцкевіч. – Мінск : Рымска-каталіцкая парафія Св. Сымона і Св. Алены, 2013. – 244 с.

57. *Дзянісаў, У. М.* Мінскі кляштар дамініканцаў / У. М. Дзянісаў, З. С. Пазняк // Помнікі мастацкай культуры: новыя даследванні. – Мінск, 1985. – С. 124–130.

58. *Габрусь, Т. В.* Апошні этап будаўнічай дзейнасці ордэна дамініканцаў у Беларусі / Т. В. Габрусь // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. – 2016. – Вып. 20. – С. 32–39.

**(Дата падачы: 28.02.2019 г.)**

*А. А. Игнатьева*
Белорусский государственный экономический университет, Минск
*H. Ihnatsyeva*
Belarus State Economic University, Minsk

**УДК 94(476.5)«1812»**

# ДВОРЯНСТВО ВИТЕБСКОЙ ГУБЕРНИИ В СОСТАВЕ ПРОНАПОЛЕОНОВСКОЙ АДМИНИСТРАЦИИ В ПЕРИОД ВОЕННОЙ КАМПАНИИ 1812 ГОДА

# THE NOBILITY OF VITEBSK PROVINCE IN THE NAPOLEONIC ADMINISTRATION DURING THE 1812 CAMPAIGN

*В статье исследуется проблема сотрудничества дворянства Витебской губернии с французской армией в период военной кампании 1812 года. Анализ широкого круга источников помог определить имущественный ценз и политический статус дворянства в составе пронаполеоновской администрации Витебской губернии, выявить основные направления ее деятельности, изучить политику российского самодержавия в отношении дворян-сторонников Наполеона на заключительном этапе кампании 1812 года и в первые послевоенные годы.*

*Ключевые слова: дворянство, пронаполеоновская администрация, военная кампания 1812 года, военное положение, депортация, российское самодержавие, амнистия.*

*The main idea of the article is to research the problem of cooperation of the nobility of Vitebsk province with the French army during the 1812 campaign. The analysis of wide range of sources allowed to determine a financial position and political status of nobility in the Napoleonic administration, to reveal the main directions of its activities, to examine the policy of the Russian autocracy to the noblemen who supported Napoleon in the end of the 1812 campaign and first post-war years.*

*Key words: nobility, Napoleonic administration, the 1812 campaign, a war footing, deportation, the Russian autocracy, amnesty.*

Проблема сотрудничества дворянства Витебской губернии с французским императором в 1812 г. неоднократно затрагивалась в отечественной историографии. Первые упоминания о событиях 1812 г. в Витебской губернии отражаются в трудах таких дореволюционных историков как А. И. Михайловский-Данилевский [1], А. М. Сементовский [2], В. М. Долгоруков [3], В. И. Глыбовский [4], В. К. Добровольский [5]. Уделив основное внимание описанию военных действий, авторы также представили фрагментарные сведения о создании пронаполеоновской администрации и дали оценку на-